# Вучэбная дысцыпліна «Марфалогія»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент * |
| **Кароткі змест** | Марфалогія, яе прадмет і задачы, сувязі з іншымі дысцыплінамі. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. Назоўнік як часціна мовы. Семантычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці назоўніка. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў і прынцыпы іх выдзялення. Прыметнік як часціна мовы. Лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя функцыі прыметніка. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў. Лічэбнік як лексіка-граматычны клас. Семантычныя асаблівасці і спецыфіка граматычных катэгорый лічэбніка. Разрады лічэбнікаў. Займеннік як часціна мовы і яго месца ў сістэме часцін мовы. Семантычная класіфікацыя займеннікаў. Разрады займеннікаў. Дзеяслоў як часціна мовы. Граматычныя катэгорыі дзеяслова. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы. Службовыя часціны мовы. Звязкі. Выклічнікі і гукаперайманні. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: БПК-10. Тлумачыць і аналізаваць граматычныя з'явы сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў залежнасці ад спецыфікі розных лексіка-граматычных разрадаў. Студэнт павінен **ведаць:** змест асноўных лінгвістычных паняццяў; тыпалогію часцін мовы, іх семантычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і словаўтваральныя характарыстыкі; навуковую і даведачную літаратуру па дадзеным раздзеле сучаснай беларускай літаратурнай мовы; літаратурныя нормы (граматычныя) сучаснай беларускай літаратурнай мовы; прынцыпы і правілы беларускага правапісу; **умець:** карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі; праводзіць лінгвістычныя назіранні і характарызаваць моўныя адзінкі з пункту іх семантыкі, структуры і функцыі; выконваць марфалагічны аналіз самастойных і службовых часцін мовы; самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па мовазнаўстве; заўважаць і выпраўляць граматычныя памылкі; **валодаць:** граматычнымі літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы; асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах; навыкамі лінгвістычнага моўнага аналізу на марфалагічным узроўні моўнай сістэмы;<br>правапісам сучаснай беларускай літаратурнай мовы. |
| **Прэрэквізіты** | "Уводзіны ў мовазнаўства", "Гісторыя беларускай літаратурнай мовы", "Беларуская дыялекталогія". |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 100 акадэмічных гадзін, з іх 56 аўдыторныя: 28 г лекцый і 28 г практычных заняткаў;<br>3 заліковыя адзінкі, 116 акадэмічных гадзін, з іх 60 аўдыторныя: 30 г лекцый і 30 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3-й семестр, залік;<br>4-й семестр, экзамен. |